# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКІХ УНІВЕРСІТЭЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ

УДК 378. 4(476-25)(091)

## 100 ГОД БДУ: ЮБІЛЕЙ, ЯКІ НАТХНЯЕ НА ПОШУК НОВЫХ І ЎДАКЛАДНЕННЕ ВЯДОМЫХ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ ПЕРШАГА ЎНІВЕРСІТЭТА БЕЛАРУСІ

***А. А. Яноўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030,*
*г. Мінск, Беларусь, helgoleg@mail. ru*

Адзначана, што падрыхтоўка да святкавання 100-гадовага юбілею дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту ўзрушыла гісторыкаў да напісання шэрагу кніг і артыкулаў, у якіх на падставе даволі шырокага комплекса крыніц паказаны этапы развіцця, выдатныя дасягненні калектыву і асобных выкладчыкаў і вучоных першага ўніверсітэта краіны. Між тым увага засяроджана на тым, што праца над выданнямі дазволіла накапіць значны дакументальны і візуальны матэрыял, які з’яўляецца падставай да працягу даследаванняў па гісторыі БДУ. Мноства ўнікальнай інфармацыі атрымана ад чытачоў выдадзеных юбілейных выданняў. Яна прымушае і дазваляе па-новаму пераасэнсаваць некаторыя старонкі мінулага як у дзейнасці ўніверсітэта ў цэлым, так і яго асобных інстытуцый, а тым больш удакладніць біяграфічныя звесткі некаторых выдатных асоб.

***Ключавыя словы***: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; юбілей; крыніцы гісторыі; новыя сведчанні; выдатныя асобы.

## 100 ЛЕТ БГУ: ЮБИЛЕЙ, КОТОРЫЙ ВДОХНОВЛЯЕТ НА ПОИСК НОВЫХ И УТОЧНЕНИЕ ИЗВЕСТНЫХ ИСТОЧНИКОВ ПО ИСТОРИИ ПЕРВОГО УНИВЕРСИТЕТА БЕЛАРУСИ

***О. А. Яновский***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030,*
*г. Минск, Беларусь, helgoleg@mail. ru*

Отмечается, что подготовка к празднованию 100-летия Белорусского государственного университета вдохновила историков к написанию ряда книг и статей, в которых показаны этапы развития, выдающиеся достижения коллектива и отдельных преподавателей и ученых первого университета страны. Между тем, акцентируется внимание на том, что работа над изданиями позволила накопить значительный документальный и визуальный материал, который является основой для дальнейших исследований по истории БГУ. Много уникальной информации было получено от читателей вышедших юбилейных изданий. Это заставляет и позволяет по-новому переосмыслить некоторые страницы прошлого в деятельности университета в целом и

его отдельных учреждений, а тем более уточнить биографические данные некоторых выдающихся людей.

***Ключевые слова:*** Белорусский государственный университет; юбилей; источники истории; новые доказательства; замечательные люди.

## BSU 100 YEARS: AN ANNIVERSARY THAT INSPIRES TO SEARCH NEW AND REFINE KNOWN SOURCES ON THE HISTORY OF THE FIRST UNIVERSITY OF BELARUS

***O. A. Yanovsky***

*Belarusian State University, Independence Avenue, 4,
220030, Minsk, Belarus, helgoleg@mail. ru*

It is noted that the preparation for the celebration of the 100th anniversary of the Belarusian State University inspired historians to write a number of books and articles, which show the stages of development, outstanding achievements of the team and individual teachers and scientists of the first university in the country. Meanwhile, attention is focused on the fact that the work on the editions allowed the accumulation of significant documentary and visual material, which is the basis for further research on the history of BSU. A lot of unique information was received from the readers of the published anniversary editions. This makes and allows us to rethink some pages of the past in the activities of the university as a whole and its individual institutions in a new way, and even more to clarify the biographical data of some outstanding people.

***Key words:*** Belarusian State University; anniversary; sources of history; new evidence; wonderful people.

Задоўга да 30 кастрычніка 2021 года – найважнейшай даты ў гісторыі беларускай вышэйшай адукацыі і навукі, бо стагадовы юбілей першага ў краіне ўніверсітэта нават сваёй лічбай натхняе на больш уважлівае асэнсаванне неверагодна разнастайных вынікаў яго дзейнасці – былі распачаты некалькі выдавецкіх праектаў. Па-першае, у 2016 г. на нарадзе, якая праходзіла непасрэдна ў кабінеце рэктара БДУ С. У. Абламейкі, сабраўшыяся гісторыкі (П. І. Брыгадзін, С. М. Ходзін, А. Г. Каханоўскі, В. Г. Шадурскі і А. А. Яноўскі) пасля працяглага абмеркавання вырашылі распачаць напісанне да юбілею адмысловай кнігі, у якой былі б прадстаўлены нарысы аб выбітных педагогах і навукоўцах універсітэта. Па-другое, у хуткім часе былі акрэслены сэнс і шляхі творчай працы па падрыхтоўцы да выдання кнігі, у якой чытач мог бы пазнаёміцца (пасля адпаведнай археаграфічнай апрацоўкі яе складальнікамі) з некаторымі важнымі складнікамі творчай спадчыны першага ўніверсітэцкага рэктара Уладзіміра Іванавіча Пічэты. Спадчына гэтая змяшчае тысячы старонак разнастайнага тэксту і да гэтага часу вядома ў агульных рысах толькі вузкаму колу гісторыкаў і ніколі не друкавалася. Тут надзеі ўскладваліся на добрыя творчыя сувязі, якія меліся ў дацэнта гістфака БДУ Міхаіла

Фёдаравіча Шумейкі з калегамі Архіва Расійскай акадэміі навук, дзе і знаходзіцца асабісты фонд У. І. Пічэты. Фонд утрымлівае вялікае мноства лістоў ягоных рукапісных і машынапісных тэкстаў.

Спачатку свае намаганні ўніверсітэцкія гісторыкі сканцэнтравалі на падрыхтоўцы першай кнігі. Але незаўбаве стала відавочным, што абмежавацца адной, нават вельмі аб'ёмістай, кнігай немагчыма. Сто гадоў гісторыі, сотні выдатных універсітэцкіх вучоных проста нерэальна было змясціць нават у самым сціслых тэкстах пад адной вокладкай. Дэталёвае асэнсаванне таго, якое выданне хоць нейкім чынам магло б выразіць памяць і павагу сённяшняга пакалення выкладчыкаў і навукоўцаў БДУ да сваіх папярэднікаў-прашчураў, падштурхнула да рэалізацыі за няпоўныя пяць гадоў сапраўднага «мегапраекта» – шматтомнага выдання, назва якога нарадзілася як бы сама сабой. Яна спалучыла два словы, якія і сёння яшчэ ў грамадстве ўспрымаюцца з пэўнай засцярогай і нават недаверам – «Інтэлектуальная эліта». Так без усялякага перабольшвання аўтарскі калектыў вызначыў ролю тых, хто за 1921–2021-я гады залажыў і ўмацаваў праз дзейнасць БДУ навукова-адукацыйныя падмуркі ўсёй Беларусі – яе грамадства і дзяржавы.

Пад час працы над першым томам гэтага выдання быў вызначаны і алгарытм падачы расказу аб «героях» нарысаў. Дзякуючы пастаянным кантактам з супрацоўнікамі Упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ (Наталляй Мікалаеўнай Герасімовіч, Аленай Аляксандраўнай Лагвіновіч, Вольгай Уладзіміраўнай Гасюк, Таццянай Юр'еўнай Таран, Наталляй Вацлаваўнай Яненка і інш.) стала магчымым выпрацаваць арыгінальную мастацка-дызайнерскую падачу тэкстаў, насычэнне іх фотаздымкамі, ажыццявіць дэталёвую рэдакцыйную апрацоўку аўтарскіх матэрыялаў. Пэўную візуальную нагрузку надалі і вокладкам: за кошт змешчаных на іх адмысловых фотаздымкаў меркавалася ўвесці чытача ў асяроддзе кожнага з пяці дваццацігоддзяў, на якія з доляй умоўнасці быў падзелены задуманы пяцітомнік «Інтэлектуальная эліта Беларусі. Распачынальнікі беларускай навукі і вышэйшай адукацыі». Яго тэксты дзеля прываблівання больш шырокага кола чытачоў аўтары пагадзіліся пісаць на рускай мове [1].

Праца над тэкстамі запатрабавала ад 40 аўтараў (такім у рэшце рэшт аказаўся агульны склад творчага калектыву, а гэта 2 рэктары БДУ, 3 дырэктары ўніверсітэцкіх устаноў, 7 загадчыкаў кафедрамі, 3 прафесары, 20 дацэнтаў, 2 старшых выкладчыка, 3 аспіранты) напружанага пошуку малавядомай і зусім эксклюзіўнай інфармацыі. Да ўвагі ў першую чаргу

браліся архіўныя дакументы, сведчанні літаратурных і навуковых крыніц, інтэрнет-рэсурсы. Асобнае месца ў працы даследчыкаў (так, кожны аўтарскі радок павінен быў мець спасылку на дакумент, хаця ў саміх кнігах тэкст даваўся без іх – дзеля аблягчэння чытання) занялі матэрыялы, выяўленыя ў асабістых, сямейных архівах, зафіксаваныя праз размовы з родзічамі і сваякамі, калегамі тых, аб кім падаваўся нарыс. Гэта было неабходна, бо ўсе тэксты па магчымасці распавядалі як аб непасрэдна творчым жыцці, працы ў БДУ (таксама да і пасля БДУ), так і ўвогуле адсочвалі жыццёвы шлях інтэлектуала ад народзінаў да апошніх дзён жыцця. Зразумела, расказ аб універсітэцкіх гадах займае абсалютна большую частку ўсіх нарысаў. І гэта расказ не толькі аб асобе, але і аб самім універсітэце, тым ці іншым факультэце, кафедры, навуковых і адукацыйных плынях, аб людзях, розных калектывах універсітэта. Герой нарыса ў цэнтры ўвагі, але ён як бы прыцягвае да сябе і сваёй справы размову аб іншых людзях БДУ і ўсёй Беларусі – калегах, кіраўніцтве рознага ўзроўню, стасунках з замежнымі навукоўцамі і г. д. У цэлым аўтары імкнуліся паказаць час, асоб, працэсы, якія адбываліся ў выкладанні і навуцы, змены парадыгм інтэлектуальнай дзейнасці і інш. Даволі шмат месца адводзіцца расказу аб грамадска-палітычным асяроддзі, у якім тварылі інтэлектуалы БДУ. І сярод іншага адсочваліся лёсы ў трагічныя для ўсіх 1930-я гады, гады Вялікай Айчыннай вайны, часы пасляваеннага ўзнаўлення дзейнасці ўніверсітэта.

Такім чынам, пяць кніг дадзенага выдавецкага юбілейнага праекта – гэта дэманстрацыя павагі і пашаны сучасных навукоўцаў БДУ да сваіх інтэлектуальных продкаў. І адначасова – гэта прадстаўленне чытачу шматвектарнай сутнасці ўсяго Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. «Гісторыя праз асобу», «інтэлектаульная гісторыя», «біяграфіка», прасапаграфічны метад правядзення даследаванняў – сучасныя трэнды, якія вядомы гісторыкам у тым ці іншым спалучэнні, набылі ў выданні «Інтэлектуальная эліта Беларусі. Распачынальнікі беларускай навукі і вышэйшай адукацыі» поўнавартаснае выкарыстанне. Сваю ролю адыгрываюць фотаздымкі, якімі насычаны тэксты, кароткія і ёмкія па сэнсу прэамбулы да кожнага з нарысаў.

Сам зацікаўлены чытач можа даць ацэнку ўсяму пяцітомніку і кожнаму з 132-х нарысаў, якія змешчаны ў ім. Між тым выснова адна – гэты праект павінен мець працяг. Ужо тое, што для аўтараў галоўнай праблемай з’яўляўся адбор імёнаў з ліку многіх соцен выдатных прадстаўнікоў гуманітарных ды прыродазнаўчых навук, матэматыкаў ды

эканамістаў, стала падставай суцяшацца перспектывай далейшай працы ў абраным накірунку. Нельга не падкрэсліць амаль што апантанасць даследчыкаў па як мага больш дэталёваму «прачытанню» жыццяпісу свайго героя. Абсалютна даследчыцкі падыход да тэкстаў дазволіў некаторым аўтарам (А. М. Максімчык, В. С. Макарэвіч, А. А. Гужалоўскі, В. А. Кахновіч, М. Ф. Шумейка, С. М. Ходзін, В. І. Яршова, А. А. Яноўскі і інш.) накоплены матэрыял аформіць у выглядзе навуковых артыкулаў і надрукаваць яго ў розных часопісах.

Адным з першых водгукаў на выданне кожнай з кніг (дарэчы, знамянальна, што сігнальны выдавецкі экзэмпляр пятай кнігі пабачыў свет якраз на дзень народзінаў У. І. Пічэты – 21 кастрычніка 2021 г. !) сталі звароты (пісьмы, тэлефонныя званкі, сустрэчы) сваякоў, калег, знаёмых тых, аб кім ідзе распавяданне. І нярэдка аўтарам прапаноўваліся да асэнсавання і магчымага ў будучыні дапаўнення ўжо надрукаванага найцікавыя звесткі, дэталі жыцця і творчасці, якія не знайшлі адлюстравання. Напрыклад, новая інфармацыя была даслана аб лёсе першага дэкана гістфака БДУ В. К. Шчарбакова. Ягоны вобраз набыў новыя фарбы, што вынікае не толькі з новых архіўных дакументаў, але і новых фотаздымкаў. Здавалася б, аб яшчэ адным даваенным дэкане ўніверсітэцкага гістфака – А. П. П'янкове – удалося напісаць даволі дэталёвы нарыс, прадставіць гэтага выдатнага навукоўца ў некалькіх артыкулах. Але калі на факультэт пасля выхаду другой кнігі «Інтэлектуальнай элиты…» ягоны ўнук Дзяніс Ігаравіч П'янкоў прынёс мноства папер з асабістага архіва дзеда, карпатліва сабраных удавой гісторыка, то стала зразумелым, што патрэбна шмат што дапаўняць і нават папраўляць. А выяўленыя новыя звесткі аб жыцці аднаго з першых прафесараў-расіязнаўцаў БДУ і выбітным метадысце выкладання гісторыі ў школах і вну Беларусі, Дз. А. Жарынаве, дапамагаюць цяпер раставіць усе кропкі над «і» у ягоным складаным лёсе пасля вымушанага развітання з Мінскам, прасачыць літаральна «выжыванне» гэтага аднаго з паплечнікаў У. І. Пічэты ў 1930-я гады, у гады Вялікай Айчыннай вайны (пад час напісання нарыса нават не ўдалося высветліць дату і месца ягонай смерці).

Такія прыклады можна было б працягваць. Чаго толькі каштуе тая інфармацыя, якую даслаў аўтару нарыса (А. М. Максімчыку) аб першым прарэктару БДУ (дакладней, намесніку Праўлення – як у пачатку дзейнасці ўніверсітэта называлася пасада «правай рукі» рэктара) – С. З. Кацэнбогене. Унук гэтага выбітнага сацыёлага і арганізатара вышэйшай

школы ў Беларусі і Расіі прывёз у Мінск вялікі стос унікальных дакументаў, што дазволіла Андрэю Мікалаевічу падрыхтаваць і апублікаваць ва ўніверсітэцкім выдавецтве ў серыі «Памяць і Слава» асобную кнігу з біяграфіяй, дакументамі і навуковымі тэкстамі Саламона Захаравіча [2]. Унікальная інфармацыя была перададзена аўтарам нарысаў ад унукаў прафесара-матэматыка І. С. Пятосіна, рэктара БДУ і прафесара-географа К. І. Лукашова, народнага пісьменніка Беларусі і прафесара-філолага І. Я. Навуменкі і інш. А дакументы і фотаздымкі, што даслаў унук не героя нарыса, а толькі мімаходзь згаданага ў юбілейных кнігах прадстаўніка першых беларускіх правазнаўцаў, Г. І. Нямытых, дазваляе ў далейшым уключыць у новыя кнігі шматтомніка пра ўніверсітэцкіх інтэлектуалаў нарыс аб наркаме юстыцыі і пракуроры БССР, а адначасова намесніку дэкана факультэта права і гаспадаркі М. А. Сегале. Як і аб двух ягоных памочніках па лініі наркамата і пракуратуры – прафесары БДУ С. М. Гохмане і згаданым вышэй Георгіі Іванавічу Нямытых. Важна, што ў такім разе магчыма сумясціць дасланыя сведчанні некалькіх архіваў з расійскай «глыбінкі», захаваныя дакументы ў сямейным архіве і матэрыялы, што ўдалося пасля кантактаў з унукам знайсці ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь [3].

Не засталіся абыякавымі і тыя гісторыкі факультэта, хто не быў задзейнічаны ў напісанні пяцітомніка. Сталі ўсё часцей узгадвацца розныя іншыя асобы, якім пакуль што «не знайшлося месца» на надрукаваных старонках. Так, найцікавыя дакументы з сямейнага архіва прынесла на факультэт дацэнт Л. Л. Міхайлоўская – дачка двух універсітэцкіх гісторыкаў Ніны Георгіеўны Паўлавай і Льва Антонавіча Міхайлоўскага. Гэта тры сшыткі канспектаў лекцый па гісторыі СССР вядомага расійскага і савецкага гісторыка Івана Іванавіча Палосіна, якія ён чытаў беларускім студэнтам на станцыі Сходня пад Масквой, а таксама некаторыя іншыя матэрыялы навукоўца Людміла Львоўна суправадзіла дакументы такім тэкстам, які ўзгадвае магчымыя абставіны, з-за якіх унікальныя дакументы расійскага гісторыка апынуліся ў сям’і гісторыкаў-беларусаў:

*«История как процесс, как закономерность и Magistra vitae никогда не прерывается окончательно. Ее нетленные нити, проходящие сквозь века и пространство, связывают как людей, так и целые поколения и возвращаются в виде неизбежных событий, процессов, научных дискуссий.*

*Осознание этого «единства времен» пришло в тот момент, когда я, пересматривая семейный архив, раскрыла ветхие тетради. Они*

*принадлежали замечательному русскому историку Ивану Полосину и хранят разнообразные материалы, в том числе по исследованию Русской Правды, которую с большим трудом изучала когда-то и я сама, слушая, а затем и читая курс по истории Древней Руси... Как попали они ко мне через столетие, какой код несут?...*

*Об Иване Полосине и его драматической судьбе мне рассказывала моя мама, Нина Георгиевна Павлова. В 1938 г. она стала студенткой исторического факультета БГУ, а в 1943 г. вместе с возобновившим свою деятельность университетом оказалась на станции Сходня под Москвой. Там она слушала лекции московских профессоров-историков, в числе которых был и И. И. Полосин. Возможно, что там он и передал ей свои исследования. Нина Павлова мечтала о диссертации по Киевской Руси. Возможно также, что эти тетради попали к ней через ее тетку (Юлию Горецкую), которая дружила с сестрой Ивана Полосина Марией Ивановной. Эти связи были особенно тесными в период работы над созданием первого школьного учебника по истории БССР (авторы – Абецедарский Л. С., Баранова М. П., Павлова Н. Г., Минск, 1959). Однако, независимо от того, как пришли к нам рукописи И. Полосина, они всегда будут образцом кропотливого (зачастую неблагодарного) труда историка».*

Асобнае месца ў даследчыцкай працы, якую праводзілі аўтары юбілейнага выдання, займала суправаджэнне тэкстаў візуальнымі крыніцамі. Толькі невялікая колькасць сабраных фотаздымкаў трапіла на старонкі кніг. Для магчымага працягу размовы ў цэлым аб гісторыі БДУ ў розных яе праявах накоплена аграмадная фотатэка, якую хацелася б і сістэматызаваць, і прадставіць на нейкіх інтэрнэт-рэсурсах. Больш за тое, новыя здымкі паступалі ў распараджэнне аўтараў амаль што кожны дзень. Шмат чаго ў гэтым накірунку зрабіў студэнт, а сёння магістрант гістфака Юрась Тамковіч, які выявіў новыя відовішчы будынкаў, у якіх у той ці іншы час месціліся ўніверсітэцкія інстытуцыі, «дакапаўся» да абставін іх уключэння ў склад БДУ, выкарыстання ў вучэбным, навуковым, гаспадарчым працэсах. І змог пад час святкавання 100-годдзя БДУ надрукаваць у выдатным навуковым выданні «Беларускі гістарычны часопіс» сваё скрупулёзнае даследаванне па гісторыі пятнадцаці «Дамоў БДУ», у якіх у 1920–1930-я гады месціўся ўніверсітэт, ягоныя факультэты, інстытуты, клінікі, інтэрнаты, жылыя дамы прафесуры і выкладчыкаў і інш. [4]. Некалькі ўнікальных фотаздымкаў (дарэвалюцыйны партрэт У. І. Пічэты, калектыўны здымак выпускнікоў адной з груп рабфака 1937 г. і

інш.) адшукаў яшчэ ў 2014 г. на інтэрнэт-аўкцыёнах цяпер ужо студэнт магістратуры Ігар Кандратовіч. Ён падараваў іх музею гісторыі БДУ і суправадзіў словамі – *«Я проста шукаў што-небудзь цікавае аб сваім Універсітэце і выпадкова натрапіў…»*.

Юбілей БДУ ўзрушыў ініцыятывы факультэтаў, навукоўцаў, студэнтаў. Іх мноства. Напрыклад, заслугоўвае асаблівай ўвагі дзейнасць гістфакаўцаў па адшукванню, прывядзенню ў прыстойны стан, мемарыялізацыі праз СМІ і фотархівы магіл універсітэцкіх вучоных – рэктараў, прафесароў, выкладчыкаў. Гэта толькі пачатак такой працы. Толькі ў апошні час былі выдадзены адмысловыя кнігі аб гісторыі і сучасным стане, аб асобах двух матэматычных факультэтаў універсітэта, факультэта міжнародных адносін, Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, кафедры фізвыхавання і спорту і інш. Існуе неабходнасць удакладніць і літаральна з нулявой адметкі расказаць аб распачынанні ва ўніверсітэце мастацкай самадзейнасці і надаць належнае ролі ў гэтай справе Уладзіслава Галубка. Малавядомымі застаюцца для нас старонкі арганізацыйна-адміністрацыйнага суправаджэння дзейнасці БДУ (тут магчыма паказаць ролю Уладзіміра Иванавича Метліна, Льва Георгіевіча Сідлярэўскага, Дзмітрыя Іванавіча Сярко – аднаго з першых «канцылярыстаў» і юрыдычных дарадчыкаў), аб функцыях Праўлення, Савета, прадметных камісій, навукова-вучэбных кабінетаў, музеяў, медыцынскіх клінік і навукова-даследчых інстытутаў. А ўдакладненні сведчанняў аб дзейнасці тых ці іншых кафедраў у сучасным разуменні сэнсу гэтых важных універсітэцкіх інстытуцый немагчыма без разумення дэфініцый гэтага пазначэння ў кантэксце амаль што цалкам 1920-х гадоў. Каб не вялася гісторыя той ці іншай «кафедры» ужо з 1921 ці 1922 гадоў, калі пад такой назвай пазначалася наяўнасць чытання пэўнага прафесарскага лекцыйнага курса, а не асобага прафесійнага калектыву. З другога боку, скарачэнне тэрміну гісторыі, напрыклад, кафедры фізкультуры амаль на 20 гадоў азначае, што мы як бы «выкідваем з памяці» дзесяткі прозвішчаў і тысячы вучэбных і грамадскіх дзеянняў, якія былі з 1928 г. ажыццёўлены поўнавартаснай адпаведнай кафедрай, што займалася арганізацыяй «фізкультурызацыі» БДУ побач з ваеннай кафедрай, якая несла адказнасць за яго «ваенізацыю»!

І калі гэта сённяшняе студэнцтва, можна казаць, пранiклася ідэяй ушанавання памяці БДУ і яго людзей, само праяўляе ініцыятыву і эўрыстычныя здольнасці, то тым больш натуральным сталі сведчанні, якія ў матэрыяльным і вербальным выглядзе не аднойчы сталі прапаноўваць

аўтарам «Інтэлектуальнай эліты…» універсітэцкія ветэраны, выпускнікі розных гадоў. Гісторыкі былі здзіўлены, калі на факультэт у пачатку 2021 года завітаў выпускнік 1951 года Яўген Яфімавіч Захараў. Гэты ветэран – чалавек з надзвычай вострай памяццю, красамоўны рытар, сведка і актыўны ўдзельнік пасляваеннага ўзнаўлення дзейнасці БДУ. Акрамя выдатных сваёй інфармацыйнай насычанасцю ўспамінаў ён падараваў факультэту, а значыць усяму ўніверсітэту, шэраг унікальных фотаздымкаў з тых часоў гісторыі БДУ. Ягоны расказ аб студэнцкім жыцці і вучобе ў разбураным фашысцкімі акупантамі Мінску натуральна дапаўняе ўспаміны прафесара і былога дэкана гістфака Іраіды Восіпаўны Царук, якой прысвечаны нарыс у пятай кнізе «Інтэлектуальнай эліты…», і ўспаміны прафесара геафака Вольгі Філіпаўны Якушка, нарыс аб якой яшчэ наперадзе. Увогуле наспела неабходнасць абагульнення такога роду ўспамінаў аб БДУ ў шэрагу выданняў. Мы маем выдатныя прыклады, якія падаюць нашы калегі з універсітэтаў Расіі, Украіны, еўрапейскіх краін. Так, у Саратаўскім дзяржаўным універсітэце за апошнія гады выдадзена мноства кніг-мемуараў прафесуры розных спецыяльнасцяў і рознага часу працы ва ўніверсітэце. Ініцыятарам такой справы з'яўляецца доктар гістарычных навук, прафесар Уладзімір Анатольевіч Саламонаў – апантаны даследчык як гісторыі свайго ўніверсітэта ў цэлым, так і шматвектарнай тэмы «людзі навукі», «інтэлектуальнай гісторыі» [5].

Асобная тэма ў кантэксце гэтай караценькай канстатацыі – дакрананне даследчыкаў самых розных асабістых навуковых прыхільнасцяў да самой тэмы «гісторыя БДУ праз жыццё і дзейнасць яго інтэлектуалаў». А тым самым спазнанне зусім новых крыніц, калі, напрыклад, медыевісты ды антычнікі павінны былі амаль што ўпершыню месяцамі працаваць з фондамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. А ўжо вопытныя ў такой справе беларусазнаўцы прыадкрылі для сябе некаторыя інфармацыйныя таямніцы маскоўскіх архіваў (Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі, Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі і інш.), не гаворачы ўжо аб рукапісах і іншага роду матэрыялах бібліятэчных сховішчаў, музейных фондаў. Гэтая праца дазволіла намеціць новыя арыенціры. Так, стала зразумелым, што да гэтага часу мы не вельмі дакладна ўяўляем сабе ход падзей 1919 – пачатку 1921 гадоў, калі пасля вядомага дэкрэта ЦВК ССРБ ад 25 лютага 1919 г. прыйшлося шмат разоў карэктаваць практычныя крокі па стварэнню ўмоў для распачынання працы БДУ. Неяк у баку ад нашай увагі застаецца і сёння той няўхільны факт, што 10 гадоў у структуры ўніверсітэта

дзейнічаў такі выдатны і знакавы факультэт, як медыцынскі. Узнаўленне творчых і жыццёвых біяграфій некалькіх ягоных прафесароў відавочна ставіць пытанне аб як мага больш поўным раскрыцці тэмы «медыцынская адукацыя, навука і практыка ў БДУ» з абавязковым уключэннем старонак аб тым, як універсітэцкія медыкі наладжвалі сістэму аховы здароўя ў маштабах усёй Беларусі, як ствараліся савецкія клінікі і бальніцы ў Мінску.

Такім чынам, юбілейнае выданне паказала, што мы толькі на пачатку шляху да напісання поўнавартаснай гісторыі нашай альма матэр, а тым больш – да праявы сваёй удзячнай памяці аб тых, хто ствараў і рухаў наперад родны ўніверсітэт у высокародных сферах вышэйшай адукацыі і вышэйшай па сваёй гуманістычнай і прагматычнай ролі навуцы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусскай науки и высшего образования. Кн. 1–5 / Под об. ред. С. В. Абламейко, А. Д. Короля.; науч. ред О. А. Яновский. Мінск: БГУ, 2017–2021.
2. Память и слава: Соломон Захарович Каценбоген. К 130-летию со дня рождения / сост. А. Н. Максимчик. Минск: БГУ, 2019.
3. НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 959; Ф. 15 п. Воп. 22. Спр. 38.
4. Юрый Тамковіч. Спроба рэканструкцыі карты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў 1921–1941 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 2021. № 10. С. 18–27.
5. Владимир Анатольевич Соломонов: Биобиблиографический указатель (1985–2012) / Авт.-сост. Ю. Г. Степанов. Саратов, 2012.